НАСТАЎНІЦКАЯ ГАЗЕТА
ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
7 красавіка 2012 года

# Перад Алімпіядай — рэспубліканская ўніверсіяда!



З прывітальным словам да ўдзельнікаў спаборніцтваў звярнуўся першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Іванавіч Жук.

**З 2 па 4 красавіка на базе спартыўнага комплексу Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта прайшлі фінальныя спаборніцтвы рэспубліканскай універсіяды па грэка-рымскай барацьбе. Удзел у іх прынялі 155 студэнтаў-спартсменаў з 25 устаноў вышэйшай адукацыі.**

Грэка-рымская барацьба — адзін з 29 відаў спорту, якія ўваходзяць у праграму рэспубліканскай універсіяды. Гэты від адзінаборстваў выклікае вялікую цікавасць у студэнцкай моладзі, таму і развіваецца ён у больш чым 30 вышэйшых навучальных установах краіны. З прывітальным словам да ўдзельнікаў спаборніцтваў падчас цырымоніі адкрыцця ўніверсіяды звярнуўся першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Іванавіч Жук.

— Адметна, што сёлета фінал рэспубліканскай універсіяды праводзіцца напярэдадні Алімпійскіх гульняў у Лондане. Беларуская школа барацьбы вядомая ва ўсім свеце. У розныя гады яе праслаўлялі чэмпіёны і прызёры Алімпійскіх гульняў Караваеў, Ліштван, Паўлаў, Каныгін і Маджыдаў. Яскравы прыклад апошняга спартсмена стаў сведчаннем таго, што і студэнт можа стаць алімпійскім чэмпіёнам, — сказаў Аляксандр Іванавіч. — Я памятаю Камандара Маджыдава, калі ён толькі прыйшоў на падрыхтоўчае аддзяленне Белдзяржуніверсітэта, а потым, набываючы адукацыю на юрыдычным факультэце, заваяваў залаты алімпійскі медаль. Усім удзельнікам фінальных спаборніцтваў рэспубліканскай універсіяды, і не толькі па грэка-рымскай барацьбе, хочацца пажадаць ставіць перад сабой самыя высокія мэты. А калі зноў вярнуцца да грэка-рымскай барацьбы, то той факт, што сярод фіналістаў універсіяды — 55 майстроў спорту, а з іх — 6 майстроў спорту міжнароднага класа, унушае аптымізм і гаворыць пра тое, што ў нашай краіне патэнцыял у гэтым відзе барацьбы ёсць.

У тым, што сярод удзельнікаў рэспубліканскай універсіяды ёсць тыя, хто папоўніць медальную скарбонку беларусаў на алімпіядах, чэмпіянатах свету і Еўропы, упэўнены і дзяржаўны трэнер Рэспублікі Беларусь па грэка-рымскай барацьбе майстар спорту міжнароднага класа Аляксандр Рыгоравіч Казоўскі, які выказаў словы падзякі ўсім вышэйшым навучальным установам, што развіваюць гэты від спорту. Трэба адзначыць і тое, што фінал рэспубліканскіх спаборніцтваў абслугоўвалі лепшыя арбітры краіны. Аднаго з іх павіншавалі прама ў спартыўнай зале: стала вядома, што беларус Ігар Брэль, арбітр міжнароднай катэгорыі, атрымаў ліцэнзію на права абслугоўваць Алімпійскія гульні ў Лондане!



— Кожны трэнер марыць аб тым, каб яго вучань трапіў на Алімпійскія гульні, кожны ўдзельнік Алімпійскіх гульняў марыць вярнуцца на радзіму чэмпіёнам. Гэтак жа і суддзя марыць трапіць на галоўныя спартыўныя спаборніцтвы свету і доўгі час адбіраецца на іх праз шэраг турніраў, — паведаміў Ігар Брэль. — Я з гонарам буду прадстаўляць нашу краіну ў Лондане і спадзяюся, што там жа не раз парадуюся за нашых спартсменаў.

А ўжо праз некалькі месяцаў у Лондане будзе сапраўды за каго пахварэць. На чэмпіянаце свету 2011 года ў Турцыі беларускія барцы "грэка-рымляне" выступілі проста бліскуча, заваяваўшы тры алімпійскія ліцэнзіі. Сярод іх — два студэнты: Алім Сялімаў з Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы ў вагавой катэгорыі да 84 кг, праявіўшы зайздроснае майстэрства і мужнасць, заваяваў залаты медаль; Цімафей Дзейнічэнка з Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны ў вазе да 96 кг заняў 5-е месца і таксама быў узнагароджаны "пуцёўкай" у алімпійскі Лондан. Яшчэ адзін цікавы факт: у склад нацыянальнай зборнай Рэспублікі Беларусь па грэка-рымскай барацьбе ўваходзяць 14 спартсменаў-студэнтаў з розных ВНУ краіны, што складае больш за палову ад усёй колькасці спартсменаў у зборнай.

Рэспубліканскай жа ўніверсіядзе ёсць таксама чым ганарыцца. Сёлета ўдзел у ёй прынялі майстры спорту міжнароднага класа: Генадзь Халявіцкі (сярэбраны прызёр першынства свету сярод моладзі 2008 года, БДУФК), Кірыл Грышчанка (сярэбраны прызёр першынства свету сярод моладзі 2011 года, БДАТУ), Валерый Паленскі (сярэбраны прызёр чэмпіянату свету сярод студэнтаў 2008 года, ГрДУ).

Па выніках фінальных спаборніцтваў былі вызначаны пераможцы ў камандным і асабістым першынстве. Чэмпіёнамі рэспубліканскай універсіяды па грэка-рымскай барацьбе сталі студэнт ГрДУ Дзмітрый Брычак (вагавая катэгорыя — 55 кг), студэнт МагДУ Ярбол Калабаеў (60 кг), студэнт ГрДУ Яраслаў Кардаш (66 кг), студэнт ГрДУ Валерый Паленскі (74 кг), студэнт БДУ Віктар Сасуноўскі (84 кг), студэнт БДУ Джавід Гамзатаў (96 кг) і студэнт БДАТУ Кірыл Грышчанка (120 кг). Камандныя месцы размеркаваліся наступным чынам: першае месца — у Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы, другое — у БДУ, трэцяе — у Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, які ўсяго на чатыры ачкі апярэдзіў гаспадароў спаборніцтваў — каманду Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, што заняла чацвёртае месца. Але рэктар БДАТУ Мікалай Уладзіміравіч Казаравец адзначыў: "Мы аграрны ўніверсітэт, а аграрыі павінны быць народам моцным. Таму здароваму ладу жыцця, фізічнаму выхаванню і грэка-рымскай барацьбе ў прыватнасці мы будзем удзяляць самую пільную ўвагу".